*Я.У. Дамброўскі*
*Навуковы кіраўнік — кандыдат гістарычных навук І.В. Грабянчук*

# НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДЫЯЛЕКТАЛАГІЧНАГА ГУРТКА СТУДЭНТАЎ БАБРУЙСКАГА НАСТАЎНІЦКАГА ІНСТЫТУТА

*У артыкуле разглядаюцца пытанні навукова-даследчай дзейнасці дыялекталагічнага гуртка Бабруйскага настаўніцкага інстытута ў 1949–1954 гг. Аналізуецца змест праграмы дзейнасці і абавязкі ўдзельнікаў гэтага гуртка, іх праца па збіранні неабходнага матэрыялу. Аўтар разглядае станоўчыя бакі і недахопы ў працы дыялекталагічнага гуртка, якія былі абумоўлены рэаліямі пэўнай гістарычнай эпохі .*

Неабходнай умовай падрыхтоўкі спецыялістаў у вышэйшых навучальных установах з'яўляецца навукова-даследчая праца студэнтаў, якая можа арганізоўвацца ў розных формах. У час існавання Бабруйскага настаўніцкага інстытута (БНІ) з 1949 па 1954 гг. асноўнай яе формай былі студэнцкія гурткі. Кожны з іх, у адпаведнасці са сваёй спецыяльнасцю, меў шэраг сваіх пытанняў і праблем, на якія накіроўваў сваю даследчую дзейнасць. Адным з такіх студэнцкіх навуковых калектываў з'яўляўся дыялекталагічны гурток. Ен дзейнічаў пры кафедры рускай і беларускай моў. Спачатку ім кіравала ст. выкладчык Горбач Хрысціна Дзмітрыеўна, а з верасня 1950 г. — ст. выкладчык Касцян Мікалай Ігнацьевіч.

Асноўнай задачай гэтага калектыва быў збор і апрацоўка інфармацыі для стварэння дыялекталагічнага атласа Беларусі, які рыхтаваў да друку Інстытут мовазнаўства Акадэміі навук БССР. Студэнты, якія ўваходзілі ў склад гуртка, займаліся палявымі даследаваннямі, зборам дыялекталагічнага матэрыялу па Бабруйскім, Кіраўскім, Клічаўскім, Любаньскім, Парыцкім раёнах.

У метадычных указаннях да праграмы па даследаванні беларускіх гаворак, распрацаваных у Акадэміі навук БССР, гаварылася, што неабходна збіраць інфармацыю, якая б высвятляла фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя асаблівасці розных дыялектаў [1, арк. 2]. Так, напрыклад, у раздзеле «Фанетыка» вылучалася тры падраздзелы: «Ненаціскныя галосныя», «Націскныя галосныя» і «Зычныя». У першым падраздзеле «Ненаціскныя галосныя» ставілася задача высвятляць вымаўленне ўсіх галосных гукаў у ненаціскных складах. Пры адказах на пытанні гэтага падраздзела асаблівую ўвагу патрэбна было звяртаць на вымаўленне этымалагічных галосных, а таксама на вымаўленне гука «А». Другі падраздзел «Фанетыкі» — «Націскныя галосныя» — выяўляў вымаўленне галосных пад націскам. Падраздзел жа «Зычныя» высвятляў прыклады пераходных да рускай мовы гаворак. Раздзелу «Лексіка» ў праграме прысвечана прыкладна столькі пытанняў, колькі прысвечана тром астатнім раздзелам разам (фанетыка, марфалогія і сінтаксіс).

Да кожнага з раздзелаў экспедытарам прапаноўвалася занісваць вялікую колькасць прыкладаў для больш дэталізаванага высвятлення праблемы. Напрыклад, у раздзеле «Сінтаксіс» так і гаварылася: сінтаксічныя асаблівасці мясцовых гаворак выяўляюцца толькі на аснове вялікай колькасці занісаў звязаных тэкстаў. З самага першага і да апошняга дня знаходжання ў абследуемым пункце ўдзельнікі экспедыцыі павінны старанна збіраць сінтаксічны матэрыял, запісваць урыўкі звязных тэкстаў, асобныя сказы з гутаркі мясцовых жыхароў між сабой, з іх апавяданняў аб розных падзеях і здарэннях з мясцовага жыцця [1, арк. 9].

За час працы ў экспедыцыях бабруйскія студэнты сабралі багаты матэрыял не толькі па дыялекталогіі, але і па этнаграфіі, высветлілі і занісалі гісторыю ўзнікнення некаторых вёсак [2, спр. 2, арк. 30, 50; спр.10, арк. 48; спр.19, арк. 90; спр. 32, арк. 126]. Такім чынам, яны збіралі матэрыялы не толькі на дыялекталагічную тэматыку, а і ў іншых навуковых накірунках.

Паводле плана дзейнасці на 1951/52 навучальны год у якасці прыярытэтнай задачы называлася паляпшэнне падрыхтоўкі студэнтаў да самастойнай работы па збору і вывучэнню беларускіх дыялектаў і класіфікацыі іх па картках згодна з праграмай. На занятках гуртка вывучаліся наступныя пытанні: параўнанне дыялектаў з літаратурнай мовай, аналіз сабраных дыялекталагічных матэрыялаў, аналіз праграмы па збору дыялектаў і інш. [1, арк. 83].

Аднак жа, нягледзячы на добра распрацаваныя канкрэтныя метадычныя ўказанні, сабраныя матэрыялы часта не адпавядалі вызначаным патрабаванням. Для разумення прычын, якія абумовілі недахопы ў дзейнасці дыялекталагічнага гуртка студэнтаў БНІ, трэба ўлічваць наступныя фактары той гістарычнай эпохі. Пасля жорсткіх сталінскіх рэпрэсій 1930-х супраць так званай «нацдэмаўшчыны» савецкая палітычная сістэма вельмі падазрона ставілася да актыўных праяваў у грамадстве беларускай нацыянальнай самасвядомасці. У той жа час улады ўрачыста дэкларавалі, што ў СССР культура з’яўляецца «нацыянальнай па форме і інтэрнацыянальнай па зместу». Адпаведна, цалкам ігнараваць усё нацыянальнае савецкая камуністычная ідэалогія ніяк не магла.

З іншага боку, паколькі мелася дзяржаўная замова на правядзенне дыялекталагічных даследаванняў, то іх арганізацыя праводзілася ў горшых традыцыях савецкай «кампанейшчыны». З пратаколаў пасяджэнняў Рады Бабруйскага настаўніцкага інстытута можна даведацца, што гэтай працай хацелі ахапіць амаль пагалоўна ўсіх студэнтаў і выкладчыкаў, але сродкі на яе выдзяляліся дрэнна, існавала шмат арганізацыйных праблем. У выніку сапраўдных энтузіястаў навукова-даследчай дзейнасці ў галіне дыялекталогіі было няшмат. Таму і казаў кіраўнік гуртка Касцян М. І. на пасяджэнні Рады інстытута: «Няма ў дырэкцыі агню, які б мабілізаваў на працу» [3, спр. 20, арк. 13]. Дырэкцыя ў даўгу не заставалася, падвяргала суровай крытыцы працу ўсіх студэнцкіх гурткоў і казала пра неабходнасць яе «карэннага паляпшэння» [3, спр. 47, арк. 6, 10].

У такіх умовах далёка не ўсе сабраныя бабруйскімі студэнтамі матэрыялы былі апрацаваны належным чынам. На гэта звярталі ўвагу загадчыка кафедры моў БНІ супрацоўнікі Акадэміі навук БССР [1, арк. 21]. Для выпраўлення недахопаў кафедры прапанавалася палепшыць працу па падрыхтоўцы студэнтаў. Удзельнікі экспедыцыі павінны былі добра ведаць праграму збору і валодаць методыкай запісу і апрацоўкай дыялектных матэрыялаў. Для аблягчэння работы кіраўнікоў дыялекталагічных гурткоў акадэмічны Інстытут мовазнаўства разаслаў па ВНУ рэспублікі зборнік «Матэрыялы першай дыялекталагічнай канферэнцыі БССР».

Такім чынам, нягледзячы на пэўныя недахопы і памылкі ў арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці дыялекталагічнага гуртка Бабруйскага настаўніцкага інстытута, яго сябрамі быў сабраны дастакова багаты матэрыял, які, безумоўна, дапамог выйсці ў свет «Дыялекталагічнаму атласу Беларусі» ў 1963 г. Разам з гэтым, праца дыялекталагічнага гуртка дапамагла высветліць і шэраг іншых навуковых пытанняў, прыкладам таму можа з'яўляцца сабраная ім інфармацыя па этнаграфіі некаторых населеных пунктаў нашай краіны. Яна мела шырокі грамадскі розгалас, пра яе двойчы пісала Бабруйская абласная газета «Савецкая Радзіма» [4].

### Список литературы

1. Матэрыялы дыялекталагічнага гуртка Бабруйскага настаўніцкага інстытута (БНІ) за 1951 — 1954 гг. // Бабруйскі занальны дзяржаўны архіў (далей — БЗДА). — Ф. 1170. — Вон. 1. — Спр. 27.

2. Гадавыя справаздачы БНІ з 1949/50 па 1952/53 навучальныя гады // БЗДА. — Ф. 1170. — Вон. 1. — Спр. 2, 10, 19, 32.

3. Пратаколы паседжанняў Рады Бабруйскага настаўніцкага інстытута // БЗДА. — Ф. 1170. — Вон. 1. — Спр. 3, 20, 33, 47.

4. У Бабруйскім настаўніцкім інстытуце [Навуковы гурток па вывучэнню мясцовага говару] // Савецкая Радзіма. — 1951. — 29 красавіка. — С. 3; Касцян, М. Запісы народных гаворак / М. Касцян // Савецкая Радзіма. — 1952. — 28 чэрвеня. — С. 3.

*Л.А. Живицкий, А.С. Мельник*

Научный руководитель — М.В. Михадюк

# ЭФФЕКТИВНОСТЬ ОЗДОРОВИТЕЛЬНОГО ОТДЫХА В САНАТОРНО-КУРОРТНЫХ УЧРЕЖДЕНИЯХ МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

*В этой работе мы проанализируем эффективность оздоровительного отдыха в санаторно-курортных учреждениях Минской области. Сравним показатели всех областей Республики Беларусь. И отметим плюсы и минусы современного подхода к организации оздоровительного отдыха в целом.*



БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by